# АНТЫЦЫПАЦЫЯ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

*Крац Ірына Дзмітрыеўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

У перакладзе з лацінскай «антыцыпацыя» (anticipatio) абазначае прадвызначэнне, прадугадванне падзей; загадзя складзенае ўяўленне аб чым-небудзь. Тэрмін «антыцыпацыя» быў уведзены ў псіхалогію нямецкім вучоным В. Вунтам у 1880 годзе, які пад антыцыпацыяй разумеў здольнасць чалавека ўявіць сабе магчымы вынік дзеяння да яго ажыццяўлення [1, с. 23]. У XX ст. у сувязі з даследаваннямі жывёл і чалавека, пазнавальных працэсаў, творчай дзейнасці для абазначэння эфектаў антыцыпацыі з'явіліся тэрміны «папераджальная дзейнасць» (І.П. Паўлаў), «апераджальнае адлюстраванне» (П.К. Анохін), «інтэрпаляцыя» (Ф. Бартлет), «экстрапаляцыя» (Л.В. Крушынскі) і інш. У працы Б.Ф. Ломава і Я.М. Суркова абагульнены і сістэматызаваны дадзеныя, якія адносяцца да праблемы антыцыпацыі, даецца азначэнне, якое стала класічным для айчыннай псіхалогіі: «Антыцыпацыя – гэта здольнасць (у самым шырокім сэнсе) дзейнічаць і прымаць тыя ці іншыя рашэнні з пэўным часава-прасторавым апярэджваннем у адносінах да чакаемых, будучых падзей» [2, с. 5]. У феномене антыцыпацыі звязваюцца разам захаванне мінулага, адлюстраванне сённяшняга і ўяўленне будучыні. У гэтым сэнсе антыцыпацыя мае ўніверсальнае значэнне для ўсіх формаў чалавечай дзейнасці. Сістэмны падыход да азначэння антыцыпацыі дазволіў выдзеліць яе асноўныя функцыі: рэгулятыўную, кагнітыўную, камунікатыўную. Рэгулятыўная функцыя праяўляецца ў абмежаванні ступеняў свабоды жывой сістэмы ў адпаведнасці з прасторава-часавай структурай асяроддзя. У сувязі з прагназуемымі змяненнямі ўмоў знешняга асяроддзя ажыццяўляецца апераджальная падрыхтоўка, прагноз вынікаў дзеянняў і пабудова яе праграмы. Усё гэта вызначае накірунак і характар паводзін у той ці іншай сітуацыі. Менавіта антыцыпацыя забяспечвае фарміраванне суб'ектам мэты, планаванне і праграмаванне дзейнасці, прыняцце рашэння, ажыццяўленне кантролю. Кагнітыўная функцыя антыцыпацыі звязана з ажыццяўленнем розных пазнавальных працэсаў. Ва ўспрыманні, якое адбываецца ў цяперашнім часе, заўсёды ёсць момант антыцыпацыі, г.зн. аднесенасць да будучыні [3, с. 73].

Антыцыпацыя ўплывае на мнемічныя працэсы. Прагназаванне з'яўляецца істотным кампанентам запамінання, захавання і ўзнаўлення інфармацыі. Інфармацыя, якая закладзена ў памяць, пры захаванні відазмяняецца, рэарганізуецца і ў змененым выглядзе ўключаецца ў новы працэс антыцыпацыі.

З працэсамі антыцыпацыі цесна звязана мысленне. Мысліцельны працэс «ёсць пошук і адкрыццё істотна новага» [4, с. 16], якое ажыццяўляецца ў форме прагназавання. На думку Б.Ф. Ломава і Я.М. Суркова, мысленне – гэта перш за ўсё прадбачанне [2, с. 11]. Такім чынам, антыцыпацыя ўяўляе сабой

праяўленне пазнавальнай актыўнасці суб’екта. Любыя зносіны, узаемадзеянні паміж людзьмі, здольнасць пазнаваць эмацыянальныя станы іншых людзей – усё гэта праяўленне камунікатыўнай функцыі антыцыпацыі. Працэс прагназавання мае месца як падчас успрымання чужога маўлення, так і пры ажыццяўленні суб’ектам уласнага выказвання. Даследаванні Г.Г. Гранік і А.М Самсонавай паказалі, што чытанне тэксту суправаджаецца прагнастычнай актыўнасцю чытача, якая, злучаючыся з яго асабістым вопытам, прыводзіць да стварэння ва ўяўленні цэласнай карціны, уласнай фабулы твора. Узніклая ўстаноўка кіруе далейшым успрыманнем тэксту [5]. Вучонымі эксперыментальна даказана магчымасць фарміравання ў чытача гнуткай устаноўкі шляхам працы над назвай твора, увагі да незнаёмых слоў, пошуку ў тэксце схаваных пытанняў і г.д. У 70-ыя гг. XX ст. Н.М. Святлоўская распрацавала методыку фарміравання тыпу правільнай чытацкай дзейнасці вучняў на ўроках пазакласнага чытання. Мэтай першага этапа працы над тэкстам у гэтай методыцы з’яўляецца фарміраванне ўмення і звычкі думаць над кнігай да чытання, прагназаваць тэму, змест кнігі, абапіраючыся на пазатэкставую інфармацыю, сістэму загалоўкаў [6, с. 62]. Развіццё такога важнага чытацкага ўмення, як антыцыпацыя, прызнаецца важным момантам падрыхтоўчага этапа працы з творам у тэхналогіі работы з тэкстам Р.М. і К.В. Бунеевых [7, с. 207].

Антыцыпацыя ў сучаснай метадычнай літаратуры разглядаецца як уменне ці здольнасць прадвызначаць, прадугадваць элементы і змест тэксту да яго зрокавага ўспрымання ці падчас яго. Упершыню антыцыпацыя як сістэмаўтваральны кампанент арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстана ў методыцы навучання рускай мове сродкамі суб’ектывацыі, распрацаванай Г.А. Бакулінай. Пад суб’ектывацыяй працэсу навучання разумеецца якасна новы ўзровень актыўнай і ўсвядомленай дзейнасці вучняў на ўроку, якая прадугледжвае іх непасрэдны ўдзел у планаванні, арганізацыі і правядзенні ўсіх ці большасці структурных кампанентаў урока, што магчыма шляхам уключэння малодшых школьнікаў у працэс антыцыпацыі [8, с. 73].

Суб’ектывацыя працэсу навучання літаратурнаму чытанню ў пачатковай школе прадугледжвае выкарыстанне антыцыпацыі на большасці структурных этапаў урока літаратурнага чытання. На этапе фармулявання вучнямі тэмы і мэты ўрока вучні з дапамогай спецыяльна распрацаваных прыёмаў на аснове глыбокай і актыўнай маўленчамысліцельнай дзейнасці самастойна, з той ці іншай ступенню дакладнасці, прадугадваюць і вызначаюць аўтара твора, які будзе вывучацца на ўроку, назву твора, а потым фармулююць тэму і мэту ўрока.

Удзел вучняў у фармуляванi тэмы і мэты ўрока прыводзіць да разумення і асэнсавання зместу і спосабаў ажыццяўлення наступных дзеянняў, забяспечвае іх уключанасць у вучэбную сітуацыю, стварае гатоўнасць да засваення ведаў, мабілізуе разумовую актыўнасць малодшых школьнікаў, а таксама развівае

інтэлектуальныя якасці вучняў: звязнае, лагічнае, доказнае маўленне, розныя віды мыслення, увагу, памяць, назіральнасць і г.д.

Абавязковым элементам падрыхтоўчага этапа працы з мастацкім творам на ўроку літаратурнага чытання з’яўляецца слоўнікавая праца, якую можна ажыццяўляць на аснове антыцыпацыі. На ўроках ліаратурнага чытання, якія праводзяцца сродкамі суб’ектывацыі, вучні самастойна тлумачаць незнаёмыя словы з новага твора без яго папярэдняга прачытання з дапамогай спецыяльна распрацаваных прыёмаў [9]. Лексічнае значэнне слова першапачаткова таксама фармулююць малодшыя школьнікі, абапіраючыся на жыццёвы вопыт, інтуіцыю. Настаўнік толькі ўдакладнальняе выказанае вучнямі. Такі падыход да правядзення слоўнікавай працы на ўроку літаратурнага чытання робіць яе больш прадуктыўнай, ажыўляе адукацыйны працэс, узмацняе развіццёвую накіраванасць урока, павышае цікавасць вучняў да вывучаемага матэрыялу.

Важным момантам падрыхтоўчага этапа, які садзейнічае павышэнню актыўнасці і ўсвядомленасці малодшых школьнікаў пры працы з новым творам, з’яўляецца прадугадванне вучнямі зместу твора па яго назве ці па іншых словах, з якімі малодшыя школьнікі знаёмяцца да чытання твора. Праверка правільнасці меркаванняў дзяцей зліваецца з праверкай першаснага ўспрымання, падчас якой вучні не толькі выказваюць свае ўражанні аб праслуханым творы, сцісла ўзнаўляюць сюжэт, але і правяраюць свае прагнозы. На развіццё механізму прагназавання, забеспячэнне асэнсаванасці, усвядомленасці чытання накіраваны такія віды заданняў, як вызначэнне жанру і тэматыкі твора па прозвішчы аўтара і назве твора, складанне папярэдняга плана тэксту ў выглядзе пытанняў да яго прачытання з улікам характару загалоўка, характару тэксту і г.д. Выкарыстанне падобнага роду заданняў значна павышае ступень удзелу малодшых школьнікаў у арганізацыі і правядзенні ўрока літаратурнага чытання, актывізуе маўленчамысліцельную дзейнасць вучняў, надае першаснаму азнаямленню з творам і аналізу тэксту мэтанакіраваны характар.

Такім чынам, антыцыпацыя вучнямі зместу і відаў сваёй чытацкай дзейнасці істотна павышае актыўнасць і ўсвядомленасць вучняў пры працы з мастацкім творам, падымае іх на пазіцыю суб’ектаў вучэбнай дзейнасці, якія актыўна і ўсвядомлена ўдзельнічаюць у планаванні, арганізацыі і правядзенні ўрока літаратурнага чытання.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Психология. Словарь ; под общ. ред. А. В. Петровского, М. Г. Ярошевского. – М. : Политиздат, 1990. – 494 с.
2. Ломов, Б. Ф. Антиципация в структуре деятельности / Б. Ф. Ломов, Е. Н. Сурков. – М. : Наука, 1980. – 280 с.
3. Ломов, Б. Ф. Вопросы общей, педагогической и инженерной психологии / Б. Ф. Ломов. – М. : Педагогика, 1991. – 196 с.

4. Брушлинский, А. В. Психология мышления и проблемное обучение. – М. : Знание, 1983. – 96 с.

5. Граник, Г. Г. Роль установки в процессе восприятия текста (на материале художественного текста)/ Г. Г. Граник, А. Н. САмсонова // Вопросы психологии. – 1983. – № 2. – С. 72–79.

6. Светловская, Н. Н. Методика внеклассного чтения / Н. Н. СВетловская. – М. : Просвещение, 1991. – 207 с.

7. Образовательная система «Школа 2100». Педагогика здравого смысла : сборник материалов ; под научной редакцией А. А. Леонтьева. – М. : «Баллас», Издательский дом РАО, 2003. – 368 с.

8. Бакулина, Г. А. Субъективизация процесса обучения русскому языку в начальной школе / Г. А. Бакулина. – Киров : Изд-во ВГПУ, 2000. – 224 с.

9. Королева, О. Н. Нетрадиционные приемы словарной работы на уроках литературного чтения / О. Н. Королева // Начальная школа плюс До и После. – 2005. – № 3. – С. 56–61.